Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Даўгінаўская сярэдняя школа
імя У.І.Слабодчыкава ”

# Карэкцыйны індывідуальны занятак

**Тэма:** гук Р

Настаўнік-дэфектолаг
Н.А. Цімашчук

**Тэма: Аўтаматызацыя гука [р] у складах і словах.** (АНМ, старэйшая група)

Форма арганізацыі работы: індывідуальны занятак

**Задачы:** замацаваць уменне дзіцяці вымаўлляць гук [р] у складах і словах;

вычыць знаходзіць гук [р] у словах;

практыкаваць ва утварэнні памяншальна-ласкальнай формы назоўнікаў;

развіваць дробную і артыкуляцыйную маторыку, цэласнае успрыняцце, памяць;

выхоўваць жаданне гаварыць правільна, інтарэс да заняткаў.

**Абсталяванне:** шнуроўка “Пятрушка на аўтамабілі”; малюнак Пятрушкі;гукавая лесвіца; гукавая дарожка; сухі басейн з фігуркамі тыгра і пудзеля; пазл “Пантэра”;прадметныя малюнкі: памідор, гарох, морква, сыр, рыба, барабан, торт, сякера,ручка, камар, робат,машына, самалёт ; малюнак верталёта; рознакаляровыя шарыкі для рэфлексіі.

**Ход занятка**

**Арганізацыйны момант.**

**Н.-д.** Сёння мы адправімся ў падарожжа. Мы пабываем у цырку. Нас чакае цікавае прадстаўленне. А дапаможа нам Пятрушка. Ён прыехаў да нас на сваім аўтамабілі.*( Настаўнік-дэфектолаг паказвае шнуроўку “Пятрушка на аўтамабілі”)*

**Артыкуляцыйная гімнастыка.**

**Н.-д.** Вясёлы Пятрушка ўсім усміхаецца, давай і мы з табой усміхнёмся *(практыкаванне “Усмешка”).* Раніцай ён п’е смачную каву з кубачка (*практыкаванне “Кубачак”)* і есць цёплыя бліны *(Практыкаванне “Блінчык”).*Пятрушка вельмі любіць качацца на арэлях, пакачаемся разам *(практыкаванне “Арэлі”).* А больш за ўсё ён любіць скакаць на кані *(практыкаванне “Конік”).* Пятрушка любіць біць у барабан *(практыкаванне “Барабаншчык”).*

**Н.-д**. Пара адпраўляцца ў цырк. Мы адправімся на аўтамабілі. (*Праца са шнуроўкай “Пятрушка на аўтамабілі”).*Малайчына! Паехалі! Р-р-р. *(Дзіця моцна вымаўляе гук [р]).*

**Асноўная частка.**

**Н.-д.** Вось мы і ў цырку.Ура! Ура! Добрай раніцы, дзетвара*! (Дзіця паўтарае за педагогам).*Прадстаўленне пачынаецца! *(Н.-д. паказвае малюнак Пятрушкі).*Сустракайце! На арэне Пятрушка з чароўнымі мыльнымі пузырамі.*(Дзіця выконвае практыкаванне на дыханне "Мыльныя пузыры" – выдзьмувае "мыльныя пузыры " з уяўных саломінак. Асцярожна – пузыры!Вось якія, паглядзі.Раздзімаюцца, блішчаць. Адрываюцца, ляцяць.)*

Н.-д. Давай паглядзім, хто сёння выйдзе на арэну. (У *сухім басейне дзіця знаходзіць фігуркі тыгра і сабакі-пудзеля).*

*(Гучыць вясёлая музыка)* **Н.-д.** Увага! На арэне тыгр Шархан са сваім нумарам.

Тыгр скача па гукавой лесвіцы і спявае песенку: Ра-ра-ра – рак,

Ро-ро ро – рот.

Ру-ру-ру - рукі.

Ры-ры-ры - рыба.

**Н.-д.** Хто гэта? *(Тыгр Шархан)* Якую ён спявае песенку? *(Дзіця паўтарае песенку Шархана)*

**Н.-д.** На арэне пудзель Артэмон! Пудзель ходзіць па гукавой дарожцы і спявае песенку:

Ар-ар-ар – шар.

Ор-ор-ор – памідор.

Ур-ур-ур – шнур.

Ыр-ыр-ыр – сыр.

**Н.-д.** Як завуць пудзеля? (*Артэмон).* Праспявай яго песенку. *(Дзіця спявае песенку Артэмона)*

**Фізкультфвілінка.**

**Н.-д.** Наш пудзель Артэмон умее не толькі песенкі спяваць, але і танцаваць. Давай разам патанцуем. *(Гучыць музыка, дзіця выконвае свабодныя рухі ў такт музыкі).*

**Н.-д.** Сустракайце! Вясёлы і гарэзлівы Пятрушка. *(Паказвае малюнак Пятрушкі).*Ён пераўтварае вялікія прадметы ў маленькія. (*Н.-д. паказвае малюнкі памідора, гароха, морквы, сыра, рыбы).*

**Н.-д.** Вялікі памідор, а маленькі *(памідорчык).* Вялікі гарох, а маленькі *(гарошак).* Вялікая морква, а маленькая *(морквачка).* Вялікі сыр, а маленькі *(сырок).* Вялікая рыба, а маленькая *(рыбка).*

**Н.-д.** Малайчына! Добра дапамог Пятрушку. А хто зараз з'явіцца на арэне ты даведаешся, калі правільна зложыш пазлы.*(Дзіця складае пантэру).*

**Н.-д.** Прадстаўленне працягваецца! Упершыню на арэне дрэсіраваная Пантэра. Яна жанглірує толькі тымі прадметамі, у назве якіх ёсць гук [р]. *(Дзіця выбірае малюнкі з гукам [р]: барабан, торт,ручка, сякера, камар, робат).* У цябе ўсё добра атрымліваецца. А хто стараецца, той многага дабіваецца.

**Н.-д.** Наша прадстаўленне заканчваецца. Ра-ра-ра – дамоў пара! *(Дзіця паўтарае за педагогам. На арэну цырка выходзяць усе артысты. Дзіця па чарзе называе кожнага)*

**Н.-д.** За тое, што ты добра дапамагаў артыстам выконваць нумары, Пятрушка дорыць табе рознакаляровыя шары.

**Н.-д.** А на чым мы адправімся дамоў, ты зараз адгадаеш: У небе – гром,

Але не воблачка кругом.

Гэта адправіўся у палёт

Вінтакрылы (верталёт). *(Педагог паказвае малюнак верталёта. Дзіця паўтарае "верталёт").*

**Заключная частка.**

**Н.-д.** Дзе мы пабывали? Які гук мы бралі з сабой у цырк? Што табе больш за ўсё запомнілася?

**Рэфлексія.**

**Н.-д.** Вазьмі шары, калі ты добра вымаўляеш гук [р] – падымі зялёны шар, калі ў цябе не заўсёды атрымліваецца гук [р] - жоўты шар.